**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь
народны Цырк імя Валерыя Абеля
дзяржаўнай установы «Палац культуры «Касцюкоўка»**

На базе дзяржаўнай установы «Палац культуры «Касцюкоўка» працуе Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны Цырк імя Валерыя Абеля, які ўжо больш за 60 гадоў здзіўляе і захоплівае сваім майстэрствам.

Ён заснаваны з невялікага гуртка арыгінальнага жанру пры палацы культуры Гомельскага ордэна У.І. Леніна шклозавода імя М.В. Ламаносава (Дзяржаўная ўстанова «Палац культуры «Касцюкоўка») у 1961 годзе і прайшоў шлях да самага вядомага брэндавага калектыву Гомельскай вобласці, які сёння прадстаўляе яе на ўсіх знакавых мерапрыемствах Рэспублікі Беларусь.

Праз 10 гадоў з дня заснавання калектыву было прысвоена найменне «Народны самадзейны калектыў мастацкай творчасці», улічваючы значны ўклад Валерыя Аляксандравіча Абеля ў развіццё самадзейнага цыркавога мастацтва горада Гомеля, 24 мая 2006 года Гомельскім гарадскім выканаўчым камітэтам было прынята рашэнне аб прысваенні яго імя народнаму цырку, у 2008 годзе на падставе рашэння калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 28.05.2008 № 83 прысвоена званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь», пацверджанне – 24.04.2014 года № 20, пацверджанне- 11.04.2019 года № 23.

Са студзеня 1987 года кіраўніком цырка з'яўляецца Таццяна Валер'еўна Абель – дачка заснавальніка калектыву, прадаўжальнік цыркавой дынастыі ў трэцім пакаленні.

На базе заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага цырка імя Валерыя Абеля дзяржаўнай установы «Палац культуры «Касцюкоўка» быў створаны аддзел цыркавога мастацтва.

Сёння цыркавое мастацтва набірае абароты і актыўна развіваецца.


60

